Чацвер, 19 Лістапад 2020

Камісія па справах няпоўнагадовых вынесла папярэджанне ліцэісту Руслану Яневічу – за ўдзел у шэсці

Друкаваць (/news/administracyiny-perasled/item/3801-za-udzel-u-shestsi?tmpl=component&print=1) | Эл. пошта (/component/mailto/?tmpl=component&template=lt_news&link=127cccb027a4c9b218303ccf781171416161b6c7)

Ацаніць гэты матэрыял (2 галасоў)



(/media/k2/items/cache/324071832d292b637d0a6b4c641067ac_XL.jpg)

Руслан Яневіч

19 лістапада ў адміністрацыі Першамайскага раёну Віцебску адбылося пасяджэнне камісіі па справах няпоўнагадовых, на якім разглядалася адміністрацыйная справа ў дачыненні да навучэнца політэхнічнага ліцэю Руслана Яневіча. За ўдзел у несанкцыянаваным шэсці камісія вынесла Руслану папярэджанне (ч.1 арт. 23.34 КаАП).

Паводле пратаколу, 20 верасня **Руслан Яневіч** *«узяў актыўны ўдзел у несанкцыянаваным шэсці», «скандаваў антыдзяржаўныя лозунгі»*.

Акрамя пратаколу і рапарту, іншых доказаў вінаватасці хлопца не было. На прадэманстраваным відэа Руслан сябе не пазнаў. З відэафайлаў не вынікала, што ён быў удзельнікам шэсця. На гэта звярнуў увагу і адвакат, і сам Руслан, але камісія заўвагу праігнаравала.

Таксама камісія адзінагалосна адмовіла Руслану Яневічу ў хадайніцтве зрабіць відэазапіс прадэманстраванага відэасюжэту.

Вывучыўшы матэрыялы, пададзены ў камісію, яе сябры палічылі, што гэтага дастаткова для вырашэння адміністрацыйнай справы. Руслан Яневіч вінаватым сябе ва ўчыненні адміністрацыйнага правапарушэння не прызнаў. Але, на погляд камісіі па справах няпоўнагадовых, яна *«знайшла сваё пацверджанне»*.

Змякчальнымі абставінамі старшыня камісіі **Марына Навіцкая** палічыла факт, што на момант учынення правапарушэння Руслану не было 18 гадоў, а таксама тое, што ён мае статус сіраты. Прапанавала выбраць у якасці меры спагнання для Руслана папярэджанне. Амаль усе сябры камісіі падтрымалі прапанову (адзін сябра падчас галасавання ўстрымаўся).

> *«Я мяркую, што камісіі па справах няпоўнагадовых – гэта анахранізм, бо атрымліваецца, што людзі без юрыдычнай адукацыі, якія слаба разбіраюцца ў заканадаўстве, надзеленыя ўладай вяршыць лёсы няпоўнагадовых, то бок лёсы будучыні Беларусы. Калі са словаў старшыні камісіі гучыць фраза, што Канстытуцыя рэгламентуецца законамі Рэспублікі Беларусь, то гэтым усё сказана, і мне дадаць няма чаго...»* – выказаўся пасля пасяджэння камісіі віцебскі праваабаронца **Павел Левінаў**.

«Я вельмі радая, што лёс мяне пазнаёміў з гэтым хлопцам. Ён – сірата. Ён вырас у дзяржаўнай установе, у дзіцячым доме, але вырас чалавекам, які адчувае справядлівасць, які адчувае межы праўды і хлусні. Як настаўніцу з вялікім стажам, мяне гэта вельмі цешыць. І тое, што гэты хлопец апынуўся ў шэрагу людзей, якія выступаюць супраць фальсіфікацыі выбараў, вельмі каштоўна», – заявіла прысутная на паседжанні былая настаўніца **Таццяна Севярынец**.

С. Горкі

Апублікавана ў Адміністрацыйны перасьлед (/news/administracyiny-perasled)

Тэгі: артыкул 23 34 КаАП (/itemlist/tag/артыкул%2023%2034%20КаАП)

Яшчэ ў гэтым разьдзеле: « У актывіста Аляксандра Мацеюка прайшоў ператрус. Міліцыянты шукалі «забароненую сімволіку» (/news/administracyiny-perasled/item/3792-prajshou-peratrus) Каталіцкі святар Вячаслаў Барок выйшаў на волю з віцебскага СІЗА » (/news/administracyiny-perasled/item/3830-barok-vyjshau-na-volyu)

Вярнуцца ў пачатак (/news/administracyiny-perasled/item/3801-za-udzel-u-shestsi#startOfPageId3801)

© 2011 - 2024 Віцебская вясна (/). Пры выкарыстаньні матэрыялаў абавязковая гіпэрспасылка. Email: vitebskspring@proton.me (mailto:vitebskspring@proton.me)

(Https(/,/,/,